# Лялька «Дамавік – дбайны гаспадар»



**Аўтар: Жызнеўская Святлана Іосіфаўна,** выхавальнік дашкольнай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі “Гальшанскі яслі-сад”

Лялька “Дамавік – дбайны гаспадар” адрасавана выхавальнікам дашкольнай адукацыі для арганізацыі тэатральна-гульневай дзейнасці выхаванцаў 3-6 год. Лялька уяўляе сабой казачны персанаж, выкананы ў скульптурна-панчошнай тэхніцы.

Асноўны матэрыял: дрот, сінцепон, капрон, ваўняныя ніткі шэрага колеру, тканіна зялёнага, чырвонага колеру, мешкавіна з ільну.

Лялька “Дамавік – дбайны гаспадар” - выкарыстоўваецца з мэтай фарміравання уяўленняў дзяцей аб культуры і традыцыях беларускага народа праз сістэматызацыю ведаў аб сям’і, родасных узаемаадносінах, праз азнаямленне з рэчамі і прадметамі сямейнага побыту. Лялька дапамагае дзіцяці пазнаваць бліжэйшы навакольны свет і з’яўляецца адным са сродкаў разумовага і эстэтычнага выхавання.

Прызначана для выкарыстання пры арганізацыі спецыяльна-арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці у якасці сюрпрызнага моманту, для арганізацыі гульнёвай дзейнасці дашкольнікаў.

***Варыянты выкарыстання лялькі “Дамавік – дбайны гаспадар”***

***1 варыянт***

Лялька “Дамавік – дбайны гаспадар” завітаў на занятак “Мая сям’я” (напрыклад: лексічная тэма “Мая сям’я. Культура узаемаадносін”). Дамавік расказвае аб сваёй сям’і, аб тым, што ён любіць дружную сям’ю, назірае за гаспадаркай і сямейным побытам. Затым просіць выхаванцаў расказаць аб сваёй сям’і.

***2 варыянт***

Гульнёвы персанаж "Дамавік – дбайны гаспадар" адпраўляецца ў сям'ю выхаванца. У чароўным пакуначку дзіця разам з бацькамі знаходзіць гульнявое заданне, падрыхтаванае педагогам, якое трэба выканаць (прыгатаваць разам з мамай салату, намаляваць з татам малюнак, вывучыць верш, праспяваць песеньку і г.д.). На наступны дзень інфармацыю аб сумеснай дзейнасці з бацькамі і Дамавіком (фотасправаздача, відэа, аўдыё-запіс і інш.) прадстаўляюць ва установу адукацыі.

***3 варыянт***

"Дамавік – дбайны гаспадар" прыходзіць у госці да дзяцей з чароўным куфэркам, у якім знаходзяцца карткі з выявай прадметаў побыту. Просіць дзяцей выбраць картку, апісаць прадмет і расказаць як ён выкарыстоўваецца.

## Лялька «Баба Яга»



**Аўтар: Жызнеўская Святлана Іосіфаўна,** выхавальнік дашкольнай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі "Гальшанскі яслі-сад"

Лялька “Баба Яга” адрасавана выхавальнікам дашкольнай адукацыі для арганізацыі мастацка-маўленчай дзейнасці дзяцей.

Лялька ўяўляе сабой цікавы казачны персанаж, выкананы ў скульптурна-панчошнай тэхніцы.

Асноўны матэрыял: дрот, сінцепон, капрон, ваўняныя ніткі шэрага колеру, рознакаляровая тканіна, мешкавіна з ільну.

Лялька “Баба Яга” – выкарыстоўваецца з мэтай далучэння дашкольнікаў да твораў беларускага фальклору (беларускіх народных казак), узбагачэння ўяўленняў дзяцей аб культуры і традыцыях беларускага народа і з’яўляецца адным са сродкаў разумовага, эстэтычнага і фізічнага выхавання, развіцця ўмення эмацыйна ўспрымаць казку, адчуваць маляўнічасць казачных вобразаў.

Прызначана для выкарыстання пры правядзенні спецыяльна-арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці (мастацка-маўленчая, мастацкая дзейнасць), пры азнаямленні з беларускай народнай казкай у якасці сюрпрызнага моманту.

***Варыянты выкарыстання лялькі “Баба Яга”***

***1 варыянт***

Лялька “Баба Яга” наведвае заняткі па развіцці маўлення і культуры маўленчых зносін (напрыклад: расказванне беларускай народнай казкі “Лісіца-хітрыца”). Ад імя Лялькі разсказваецца казка, затым выхавальнік праводзіць гутарку па зместу казкі. На наступным этапе Баба Яга прапаноўвае выхаванцам расказаць казку.

***2 варыянт***

“Баба Яга” прыходзіць у госці да дзяцей, прапаноўвае гульню “Адгадай казку”. Дэманструе адну ілюстрацыю з шэрагу ілюстрацый да беларускіх народных казак, просіць дзяцей адгадаць з якой яна казкі і згадаць змест казкі.

## Лялькі «Ясь і Яніна»



**Аўтар: Жызнеўская Святлана Іосіфаўна,** выхавальнік дашкольнай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі “Гальшанскі яслі-сад”

Лялькі “Ясь і Яніна ” адрасаваны выхавальнікам дашкольнай адукацыі для арганізацыі маўленчай дзейнасці дзяцей.

Лялькі ўяўляюць сабой яркіх, сучасных персанажаў, выробленых з тканіны, выкананых ў скульптурна-панчошнай тэхніцы.

Лялькі “Ясь і Яніна” – выкарыстоўваюцца з мэтай паступовага ўвядзення беларускай мовы ў розныя віды дзейнасці выхаванцаў. Выкарыстанне ў спецыяльна-арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці лялек спрыяе фарміраванню ўстойлівай цікавасці і станоўчага стаўлення да нацыянальнай мовы, жадання авалодаць беларускай мовай.

Прызначаны для выкарыстання ў нерэгламентаванай дзейнасці, у якасці сюрпрызнага моманту ў спецыяльна-арганізаванай дзейнасці.

***<u>Варыянты выкарыстання лялек “Ясь і Яніна”</u>***

***<u>1 варыянт</u>***

Лялькі “Ясь і Яніна” (разам, або паасобку) “наведваюць” гульні, гульні-заняткі па развіцці маўлення і культуры маўленчых зносін у якасці сюрпрызнага моманту. Ствараючы сітуацыі зносін на беларускай мове (“Давайце пазнаёмімся”, “Назаві ласкава”, “Даскажы слоўца” і г.д.) дзеці вучацца прыслухоўвацца да роднай мовы, успрымаць і разумець яе.

***<u>2 варыянт</u>***

Ясь і Яніна (разам, або паасобку) “прыходзяць” да дзяцей і цікавяцца іх заняткамі, гульнямі, размаўляючы толькі па-беларуску наладжваюць сітуацыйна-дзелавыя зносіны ў нерэгламентаванай дзейнасці: задаюць пытанні, называюць асобныя прадметы, выконваюць розныя дзеянні з імі, расказваюць нескладаныя гісторыі.

***<u>3 варыянт</u>***

Ясь і Яніна (разам, або паасобку) “прапаноўваюць” дзецям пагуляць у гульню “Назаві па-беларуску”. У чароўным куфэрку знаходзяцца карткі з выявай прадметаў, з’яў (у залежнасці ад лексічнай тэмы тыдня). Просяць дзяцей выбраць картку, назваць і апісаць прадмет або з’яву, звяртаючы ўвагу на выкарыстанні слоў беларускай мовы.

<u>**Лялькі «Лялькі-Беларусачкі»**</u>



**Аўтар: Жызнеўская Святлана Іосіфаўна,** выхавальнік дашкольнай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі "Гальшанскі яслі-сад"

"Лялькі-Беларусачкі" адрасаваны выхавальнікам дашкольнай адукацыі для арганізацыі мастацкай, тэатральна-гульнёвай дзейнасці дзяцей.

Лялькі ўяўляюць сабой яркіх, сучасных персанажаў, вырабленых з тканіны, выкананых ў скульптурна-панчошнай тэхніцы.

"Лялькі-Беларусачкі" – выкарыстоўваюцца з мэтай фарміравання ўяўленняў аб культуры і традыцыях беларускага народа праз азнаямленне з дзяржаўнымі і народнымі святамі, у якіх адлюстроўваюцца назапашаныя стагоддзямі танчэйшыя назіранні за характэрнымі асаблівасцямі пор года, зменамі надвор'я, паводзінамі птушак, насякомых, раслін, звязаныя з працай і рознымі бакамі грамадскага жыцця чалавека.

Выкарыстанне "Лялек-Беларусачак" зробіць працэс азнаямлення дашкольнікаў з дзяржаўнымі і народнымі святамі цікавым і больш запамінальным, а пабуджэнне да актыўнага ўдзелу ў святах будзе спрыяць узбагачэнню ведаў дзяцей пра народныя традыцыі.

Прызначаны для выкарыстання ў нерэгламентаванай дзейнасці, у якасці сюрпрызнага моманту ў спецыяльна-арганізаванай дзейнасці.

<u>***Варыянты выкарыстання "Лялек-Беларусачак"***</u>

***1 варыянт***

“Лялькі-Беларусачкі” (разам, або паасобку) “наведваюць” гульні, гульні-занятк і падчас гутарак знаёмяць выхаванцаў з беларускімі народнымі святамі, з беларускімі дзяржаўнымі святамі. Затым, пры правядзенні мерапрыемстваў “запрашаюць” выхаванцаў стать непасрэднымі іх удзельнікамі.

***2 варыянт***

“Лялькі-Беларусачкі” прыходзяць у госці да дзяцей, прапаноўваюць гульню “Адгадай свята”. Дэманструюць адну ілюстрацыю з шэрагу ілюстрацый да беларускіх народных і дзяржаўных свят, просяць дзяцей назваць свята і расказаць аб ім.

## Лялькі «Дзед і Баба »



**Аўтар: Жызнеўская Святлана Іосіфаўна,** выхавальнік дашкольнай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі “Гальшанскі яслі-сад”

Лялькі “Дзед і Баба” адрасаваны выхавальнікам дашкольнай адукацыі для арганізацыі адукацыйнай, выхаваўчай, тэатральна-гульнёвай дзейнасці выхаванцаў 3-6 год.

Лялькі ўяўляюць сабой казачных персанажаў, выкананы ў скульптурна-панчошнай тэхніцы.

**Асноўны матэрыял:** дрот, сінцепон, капрон, ваўняныя ніткі, рознакаляровыя ільняныя тканіны.

Лялька “Дзед і Баба” – выкарыстоўваецца з мэтай далучэння дашкольнікаў да тэатральна-гульнявой дзейнасці па матывах твораў беларускага фальклору (казкі, песенкі, прыказкі, прымаўкі і г. д.). Выкарыстанне лялек “Дзед і Баба” спрыяе развіццю і узбагачэнню зместу работы па азнаямленні дашкольнікаў з творамі беларускага народнага фальклору.

Прызначана для выкарыстання пры арганізацыі спецыяльна-арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці у якасці сюрпрызнага моманту, для арганізацыі гульнёвай дзейнасці дашкольнікаў.

***Варыянты выкарыстання лялек “Дзед і Баба”***

***1 варыянт***

Лялькі “Дзед і Баба” (разам, або паасобку) “наведваюць” гульні, гульні-заняткі і падчас гутарак знаёмяць выхаванцаў з творамі беларускага народнага фальклору. Павышэнню якасці засваення пазнавальнага матэрыялу спрыяе выбар прыёмаў работы выхавальніка: сюрпрызны момант(прыход госця, запрашэнне у падарожжа); гульнявыя прыёмы (“пытаю-адказвай”, “заплюшчы вочы і уяві…”); хатнія заданні “Дзеда і Бабы” (“спытай у бабулі”, “схадзі на экскурсію”, “прачытай і вывучы”).

***2 варыянт***

“Дед і Баба” могуць “прапанаваць” творчыя заданні па знаемых творах беларускага фальклору: “Намалюй, што уявіў”, “Прыдумай сам”

***3 варыянт***

Лялькі “Дзед і Баба” пабуджаюць дзяцей да гульні-драматызацыі або інсцэніроўкі вядомых твораў малых форм беларускага фальклору (вершы, пе